# Навіны

БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 21 (54)

13 ліпеня 2001 г.


# Кандыдат ад дэмакратаў мусіць быць адзін



**Аргкамітэт Кангрэсу дэмакратычных сілаў распаўсюдзіў заяву за подпісам свайго старшыні Юрыя Хадыкі, у якой называе сытуацыю, што склалася ў выбарчай прэзыдэнцкай кампаніі, вельмі небясьпечнай для лёсу Беларусі.**

Аргкамітэт КДС лічыць, што ў выніку вылучэньня некалькіх дэмакратычных кандыдатаў раскол электарату непазьбежны, і гэта прывядзе толькі да перамогі існуючага рэжыму. Акрамя таго, улічваючы абмежаваныя магчымасьці дэмакратычных сілаў у інфармаваньні грамадзтва, нельга зацягваць працэс вылучэньня адзінага кандыдата. Але, нават калі дэмакратычныя прэтэндэнты не дамовяцца між сабой, аргкамітэт КДС ня схільны лічыць гэта сур'ёзнай перашкодай на шляху аб'яднаньня дэмакратычных сілаў.

"Калі чацьверка* ня здолее дамовіцца аб адзіным кандыдаце, – гаворыцца ў заяве, – мы будзем вітаць пагадненьне хаця б двух прэтэндэнтаў на карысьць аднаго зь іх. Мы сканцэнтруем усе сілы палітычных партыяў і іншых структураў грамадзянскай супольнасьці на іхнай падтрымцы. Мы поўныя рашучасьці падтрымаць такі мэханізм вылучэньня адзінага кандыдата, які будзе ўлічваць рэальны расклад сілаў у дэмакратычным лягеры.

15 ліпеня 2001 году – апошняя дата, да якой мы будзем чакаць дабрахвотнага рашэньня дэмакратычных кандыдатаў. Кангрэс дэмакратычных сілаў адбудзецца паміж 29 ліпеня і 5 жніўня бягучага году, дзе будзе падтрыманы адзіны кандыдат".

** аргкамітэт КДС ня лічыць лідэра ПКБ С. Калякіна дэмакратычным кандыдатам, але, як вядома, ён разам з Домашам, Чыгіром, Ганчарыкам і Казлоўскім уваходзіць у "аб'яднаную пяцёрку".*

Д. Н.

vytoki.net

# Мэмарандум Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў

***пра вылучэньне кандыдатаў у тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.***

1. Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, сфармаваныя 18 - 20 чэрвеня 2001 г., нелегітымныя, таму што пры іх фармаваньні ўлады парушылі беларускае заканадаўства і міжнародныя пагадненні:

– не праінфармавалі грамадзянаў пра тэрміны і парадак вылучэньня ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі;

– незаконна перашкаджалі рэгістрацыі прадстаўнікоў апазыцыі, вылучаных згодна зь дзейным заканадаўствам;

– ажыццяўлялі перасьлед і адміністрацыйны ўціск апазыцыйных кандыдатаў у сябры выбарчых камісіяў і грамадзянаў, якія іх падтрымалі;

– сфальсыфікавалі дакумэнты на вылучэньне неабходных уладам людзей;

– сфармавалі тэрытарыяльныя камісіі ў абстаноўцы таемнасьці па загадзя незаконна зробленых сьпісах.

2. Незаконна сфармаваныя тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі сьведчаць пра падрыхтоўку маштабных фальсыфікацыяў падчас прэзыдэнцкіх выбараў, таму што:

– у склад камісіяў не былі ўключаныя прадстаўнікі апазыцыйных палітычных партыяў;

– большасьць сябраў камісіяў мае вопыт фальсыфікацыяў падчас выбараў у "палату прадстаўнікоў" 2000 г.;

– камісіі цалкам кантралююцца выканаўчай уладай і залежаць ад яе;

– большасьць сябраў камісіяў заангажаваныя рэжымам альбо займаюць пасады, залежныя ад кандыдата ў Прэзыдэнты А. Лукашэнкі.

3. Міжпартыйны цэнтар па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў выканаў свае функцыі па вылучэньні у тэрытарыяльныя камісіі:

– зарэгістраваў, у адпаведнасьці з законам, больш за 600 кандыдатаў у сябры тэрытарыяльных выбарчых камісіяў ува ўсіх рэгіёнах Рэспублікі Беларусь;

– праінфармаваў беларускае грамадзтва й міжнародную супольнасьць аб фактах парушэньня закону і правоў чалавека;

– на справе паказаў, што ў Беларусі магчымае супрацоўніцтва розных палітычных сілаў дзеля пабудовы грамадзянскай супольнасьці.

4. Міжпартыйны цэнтар лічыць неабходным роспуск тэрытарыяльных выбарчых камісіяў і фармаваньне іх наноў згодна з заканадаўствам, таму што бяз гэтага немагчымае:

– правядзеньне свабодных выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі;

– гарантаваньне грамадзянам Рэспублікі Беларусі ўсеагульнага і роўнага выбарчага права;

– забесьпячэньне працэдуры свабоднага галасаваньня, праўдзівага падліку галасоў і афіцыйнага паведамленьня аб ім;

– рэалізацыя права кандыдатаў у Прэзыдэнты канкураваць у працэсе выбараў без дыскрымінацыі;

– рэалізацыя юрыдычных гарантыяў, якія дазваляюць палітычным партыям і арганізацыям канкураваць на аснове роўнасьці перад законам і органамі ўлады;

– забесьпячэньне права кандыдату, што атрымаў неабходную паводле закону колькасьць галасоў, належным чынам заступіць на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі.

5. Міжпартыйны цэнтар усьведамляе, што роспуску незаконна сфармаваных тэрытарыяльных выбарчых камісіяў можна дамагчыся толькі пры:

– падтрымцы гэтага патрабаваньня ўсімі прэтэндэнтамі ў кандыдаты ў Прэзыдэнты, акрамя А. Лукашэнкі;

– акцыях пратэсту дэмакратычных палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў, прафсаюзаў, незалежных СМІ;

– належнай ацэнцы міжнароднымі структурамі фактаў парушэньня заканадаўства і правоў чалавека пры стварэньні тэрытарыяльных камісіяў;

– афіцыйных заявах урадаў суседніх з Рэспублікай Беларусь краінаў, зацікаўленых у дэмакратычным і мірным разьвіцьці нашага грамадзтва;

– адпаведнай рэакцыі ўраду Злучаных Штатаў Амэрыкі, які неадназова даваў ацэнку фактам парушэньня правоў чалавека ў Беларусі;

– афіцыйнай рэакцыі эўраструктураў, калі яны не пажадаюць ківавацца падвоенымі стандартамі адносна правоў чалавека ў Беларусі;

– адпаведных захадах прэзыдэнта і ўраду Расейскай Фэдэрацыі, ад якіх залежаць сёньняшнія ўладныя структуры ў Беларусі. Пры гэтым нагадваем пра асаблівую адказнасьць Расейскай Фэдэрацыі, якая ў 1996 годзе падчас візыту Чарнамырдзіна, Строева, Селязьнёва выступала гарантам захаваньня правоў чалавека і пагадненьня між рознымі галінамі ўлады.

**26 чэрвеня 2001**
**г. Менск**



# Заява Ўправы Партыі БНФ

**7 ліпеня супрацоўнікамі КДБ быў затрыманы намесьнік старшыні Партыі БНФ Павал Севярынец. Прад'явіўшы сп. Севярынцу позву да сьледчага Вараб'ёва, супрацоўнікі спэцслужбы тут жа "прапанавалі праехаць" на допыт у якасьці сьведкі па справе выбуху ля расейскай амбасады.**

Такая акцыя КДБ выклікае шмат пытаньняў. Па-першае, сьведку затрымлівае цэлая каманда спэцслужбоўцаў і фактычна ажыццяўляе прывод на допыт без папярэдняга паведамленьня. Сьледчых цікавіць усё што заўгодна, акрамя самога выбуху. КДБ перад выбарамі імкнецца зьвязаць прозьвішча аднаго зь лідэраў нашае партыі з сумнеўнай правакацыяй.

Управа Партыі БНФ разглядае гэтае затрыманьне й допыт як яскравы факт псыхалягічнага ўціску і выказвае з гэтае нагоды рашучы пратэст. Рэпрэсіўная сыстэма рэжыму імкнецца зрабіць усё, каб запалохаць грамадзтва перад выбарамі. Мы расцэньваем апошнія факты парушэньня правоў чалавека менавіта як сілавы, гвалтоўны і грубы адказ дыктатуры на акцыі франтаўскае моладзі, на актывізацыю дэмакратычных сілаў.

Але нас не запалохаць!

Жыве Беларусь!

**7 ліпеня 2001 г. Менск**


vytoki.net

# ЯКАЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ – ГЭТКАЕ Й СЬВЯТА

**"Сьвята гораду – Дзень Рэспублікі (Незалежнасьці) – гэта, відавочна, не агульнанароднае сьвята, а хіба што піараўская акцыя прэтэндэнта на кандыдата ў прэзыдэнты Лукашэнкі А. Р. Шмат пісалася аб недарэчнасьці гэтых сьвяткаваньняў з пункту гледжаньня гістарычнай адпаведнасьці, сыстэмы каштоўнасьцяў, што навязваюцца грамадзтву, і, нарэшце, эканамічнай мэтазгоднасьці. Але ўсё гэта выступае на задні плян, калі глянуць на сытуацыю вачыма кіраўнікоў лукашэнкаўскай передвыбарчай кампаніі.**



*Падчас параду*

Пампэзныя сьвяткаваньні, расцягнутыя на чатыры дні, меліся, напэўна, схіліць на бок рэжыму больш людзей, і больш надзейна, чым усялякія там тэлеопусы Азаронка-Зімоўскага-Новікава. Хаця вялікай частцы электарату пляваць на парады лыжнікаў ды канцэрты ваенных аркестраў, а тым больш на сэнс усіх гэтых мерапрыемстваў – мусіла, відаць, зьявіцца думка: "Якая харошая ў нас уласьць!" – бо чатыры выходных, спакойна піць можна!.. Вось і рабілі ўлады ўсё, каб ператварыць людзей у шэрую масу, што "адпачывала" б ды пялілася на відовішчы. У гэткім стане разважаць ужо цяжка, хіба што ўспрымаць. І тады можна закідваць у масу палітычныя ўстаноўкі: што ў дзень вызваленьня Менску вызвалілася ўся Беларусь, што аднаўленьне ўлады Масквы – гэта й ёсьць незалежнасьць, што народ любіць свайго прэзыдэнта... Народу збольшага ўсё роўна – хто бадзяецца па вуліцах у пошуку атракцыёнаў і "яшчэ па адной", а хто й зьбег на "фазэнду" вырасьціць што паесьці. Але, можа, на падкорку што й адкладзецца. І ўжо дакладна цяжка будзе падняць народ на любыя апазыцыйныя акцыі – чаго пратэставаць, пляшку ў рукі, ці рыдлёўку – і гуляй!.. Такая добрая нагода – "празьнік", выходныя...

Відавочна, гэтыя ці падобныя спадзяваньні і ўскладаў рэжым на "сьвята Рэспублікі". Хоць і, сапраўды, гэта ня сьвята. Не народнае. А той старой партыйнай намэнклятуры, якую й прывялі да ўлады "вызваленцы" 1944-га, ды ейных сёньняшніх нашчадкаў, што пануюць над намі. Гэта іхны дзень, іхная "рэспубліка", іхная незалежнасьць – ад народу. Гэта іхнае сьвята, пра што сьведчаць спэцпропускі ды міліцэйскія кардоны, якія адгароджвалі той самы народ ад эпіцэнтру "народнага сьвяткаваньня".

**Андрусь УНУЧАК**

Кроніка

# "Павінна быць удзячная і ўсім задаволеная"

**Залежнасьць грамадзянаў, што жывуць у інтэрнатах, неаднаразова выкарыстоўвалася ўладамі ў выбарчы пэрыяд. Тое ж адбываецца і зараз, напрыклад, у інтэрнаце № 1 Беларускага ўнівэрсытэту культуры. Там камэндант Паскробка Натальля Аляксандраўна і выхавацелька Канаш Алена Аляксееўна вялі збор подпісаў за Лукашэнку А. Р. у прымусовым парадку.**

Камэндант уносіла зьвесткі з пашпартоў студэнтаў у падпісныя лісты, дзе студэнты расьпісваліся пры высяленьні зь інтэрнату. Пры гэтым Н. Паскробка не тлумачыла ім, дзе яны ставяць свой подпіс. Адна са студэнтак, даведаўшыся ў чым справа, адмовілася падпісвацца за Лукашэнку. Камэндант жа "абавязак" падпісацца за дзеючага прэзыдэнта патлумачыла тым, што дзяўчына "вучыцца ў дзяржаўным унівэрсытэце, атрымлівае стыпэндыю, жыве ў інтэрнаце – і павінна быць удзячная і ўсім задаволеная".

У гэтым жа інтэрнаце (вул. Рабкораўская, 15) некалькі разоў студэнтаў спынялі на вахце і прымушалі падпісвацца за Лукашэнку.

"Я думаю, што для кіраўніцтва інтэрнату зьбіраць подпісы – гэта загад зьверху, – кажа адна са студэнтак 4 курсу БУК, – таму што так ціснуць і з такой упэўненасьцю рабіць антызаконныя дзеяньні можна толькі маючы трывалы "дах", упэўненасьць у тым, што табе нічога не пагражае за гэта. Многія студэнты саступаюць і не адстойваць свае правы, ведаючы "інтэрнатаўскія" мэтады барацьбы зь іншадумцамі".

**Маша САВУШКІНА**



vytoki.net

# Купальле з Маладым Фронтам: агні на вадзе ў цэнтры Менску

**З 6 на 7 ліпеня менскі Малады Фронт правёў буйную мабілізацыйную акцыю "ВЫБАРЫ НА КУПАЛЬЛЕ". Каля 30-ці актывістаў МФ у аранжавых мабілізацыйных майках са значкамі "Выбірай!" прайшлі маршам па цэнтральных вуліцах сталіцы да Траецкага прадмесьця, гучна заклікаючы моладзь да ўдзелу ў выбарах. У 23:00, калі на берагах Сьвіслачы ў гэтым раёне сабралася некалькі тысячаў маладых гараджанаў, маладафронтаўцы арганізавалі фэерычнае відовішча.**

На ваду на драўляных плытах было спушчана дванаццаць макетаў выбарчых скрыняў (амаль у натуральную велічыню). Унутры скрыняў, склееных з паперы, былі запаленыя сьвечкі, на баках былі наклееныя каляровыя сонейкі – сымбалі мабілізацыйнае кампаніі "Выбірай!" і адначасова знакі Купальскага сьвята. Яркія плывучыя агні-скрыні былі цудоўна відаць з абодвух берагоў. Затым, пад дружныя воплескі й галёканьне 300-350 гледачоў, што сабраліся ля Траецкага, дзяўчаты з МФ пачалі кідаць у вады вянкі, што сымбалізавалі кандыдатаў у прэзыдэнты. Запуск суправаджаўся гумарным палітычным камэнтаром, напрыклад:

"Лепш Сініцын у рацэ, чым Машэрава ў бюлетэні",

"Домашу трэба адмыцца ад іміджу БНФ, а то падмочаць рэпутацыю ці ўтопяць",

"Сяргей Калякін, Савецкі Саюз! Прашу лічыць яго камуністам!",

"Прэм'ера! Прэм'ера! Запускаем былога прэм'ера – Чыгіра!".

А. Лукашэнку ўдзельнікі пэрформансу выявілі ў выглядзе вянка з "лысым" паветраным шарыкам. "Русалка", якая аказалася ў вадзе, хуценька лопнула шарык і ўцягнула вянок Лукашэнкі на дно: маўляў, Рыгоравіч "прыплыў".

Некалькі маладафронтаўцаў не пабаяліся кінуцца ў ваду й арганізавалі скандаваньне на плыву: "Жыве Беларусь!".

Напрыканцы акцыі, ужо апоўначы, Малады Фронт правёў сярод гледачоў "Выбараў на Купальле" віктарыну, дзе разыграў майкі й значкі з сымболікай мабілізацыйнае кампаніі.

Міліцэйскі патруль, які зьявіўся паблізу акцыі ў гэты момант, палічыў за лепшае не падыходзіць да вялізнага начнога маладзёвага гульбішча. Затым маладафронтаўцы дружнай кампаніяй прайшліся набярэжнай, дзе моладзь сьвяткавала Купальле, і заклікалі ўсіх прыходзіць на выбары – ЗРАБІЦЬ ПРЭЗЫДЭНТА!










*Купальле з Маладым Фронтам*

vytoki.net

# Розная колькасьць – якая якасьць?

**Тыдзень застаўся да завяршэньня збору подпісаў у падтрымку кандыдатаў у прэзыдэнты. Тры тыдні па ўсёй Беларусі ініцыятыўныя групы прэтэндэнтаў прапаноўвалі людзям падпісацца за новага прэзыдэнта, і іх, што дзіўна ў нашай краіне, ніхто асабліва не чапаў. Каб падтрымаць некаторых прэтэндэнтаў, нават зьбіраліся чэргі.**

Каб даведацца, як ідзе збор подпісаў, наш карэспандэнт зьвязаўся з штабамі магчымых кандыдатаў.

117 534 чалавекі (па стане на 8 ліпеня) падпісаліся за Сямёна Домаша. Кіраўнік ягонай ініцыятыўнай групы Яўген Лабановіч запэўніў, што да 20 ліпеня будзе назьбірана ад 150 000 да 200 000 подпісаў.

На 3 ліпеня за Ўладзімера Ганчарыка назьбірана 102 350 подпісаў. З тае прычыны, што неабходная колькасьць ужо сабраная, ягоны штаб спыніў штодзённы маніторынг.

У штабе Сяргея Калякіна паведамілі, што ўжо ёсьць ад 75 000 да 90 000 подпісаў.

Міхаіл Чыгір на 8 ліпеня меў 76 000 подпісаў.

У штабе Паўла Казлоўскага адмовіліся даваць зьвесткі. На пытаньне, чаму, быў адказ: "Каб не сурочыць."

У Аляксандра Ярашука сабрана больш за 60 000.

Сп. С. Антончык адказаў, што мае 65 000 подпісаў, але ўпэўнены, што праблемаў ня будзе.

Як паведамілі ў штабе Сяргея Гайдукевіча, на 9 ліпеня было назьбірана 107 000 подпісаў, але на гэтым спыняцца не зьбіраюцца, збор будзе працягвацца. (Пра тое, што патрэбная лічба подпісаў ёсьць, Гайдукевіч заявіў яшчэ ў першы тыдзень збору подпісаў).



На раніцу 10 ліпеня ў сп. В. Цярэшчанкі (пры яго найвялікшай ініцыятыўнай групе ў 6069 чалавек) назьбірана 76 000-79 000 подпісаў.

Паколькі зьвесткі былі ўзятыя ў штабах саміх кандыдатаў, наколькі яны сапраўдныя, можна толькі здагадвацца. І яшчэ невядома, што пасьля 20 ліпеня скажа Цэнтравыбаркам...

Нагадем вынікі апытаньня НІСЭПД у рамках праекту "Беларусь – пэрспэктывы ў XXI стагодзьдзі". На 1 чэрвеня ўсталявалася тройка лідэраў сярод дэмакратычных кандыдатаў. За Чыгіра зьбіралася галасаваць 17,1% апытаных (прычым у параўнаньні з красавіком рэйтынг М. Чыгіра крыху зьнізіўся). Вырасла колькасьць ахвотных галасаваць за С. Домаша – з 8,1 (на 01.04) да 12%. Рэйтынг Ул. Ганчарыка амаль не зьмяніўся – 10,1% (было 10,3%).

Дарэчы, прадстаўнікі ініцыятыўных групаў дэмакратычных кандыдатаў гавораць пра тое, што зьніжаецца актыўнасьць насельніцтва. Яны гэта тлумачаць тым, што дзяржаўная прэса "раскручвае" толькі аднаго кандыдата – Лукашэнку.

**Настасься ГЕРАСІМОВІЧ**

# КДБ затрымала лідэра МФ

**Раніцай 7 ліпеня супрацоўнікамі КДБ быў затрыманы старшыня Маладога Фронту Павал Севярынец**

Каля 11-й раніцы на вуліцы да яго падышлі трое, паказалі пасьведчаньні супрацоўнікаў КДБ і позву на допыт да следчага 3-га аддзелу Вараб'ёва С. А. Севярынца даставілі ў Камітэт Дзяржаўнай Бясьпекі па вул. Камсамольскай і дапыталі ў якасьці сьведкі па справе выбуху ля расейскай амбасады, які адбыўся 30 траўня. Допыт цягнуўся каля гадзіны. Практычна ніякіх пытаньняў адносна самога выбуху Паўлу зададзена не было, што сьведчыць пра "піараўскі" зьмест акцыі: па ўсім відаць, што галоўнай задачай затрыманьня было хоць нейкім чынам зьвязаць наймацнейшую маладзёвую сілу й дзіўны "тэракт".

Малады Фронт расцэньвае факт такога затрыманьня й допыту як адзін з мэтадаў псыхалягічнага ўціску на нацыянальны рух моладзі і папярэджвае, што новае пакаленьне беларусаў рыхтуецца выйсьці на выбары 9 верасьня, а затым, калі спатрэбіцца, на вуліцы й плошчы, каб адстаяць дэмакратыю, незалежнасьць і свабоду ў сваёй краіне. Малады Фронт грунтуецца на нацыянальнай ідэі й хрысьціянскіх прынцыпах – мы пераможам і бяз зброі, гранатаў і тэрактаў.

Старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Вінцук Вячорка так пракамэнтаваў гэтае затрыманьне: "Мы разглядаем гэты допыт як непрыкрытае цкаваньне фронтаўскай моладзі і самога БНФ. Лішне казаць, што ніякага дачыненьня да гвалтоўных акцыяў ні БНФ, ні Малады Фронт мець ня можа, бо менавіта негвалтоўны супраціў рэжыму – падстава нашае дзейнасьці. Мы змагаемся справядлівымі мэтадамі ў адрозьненьні ад Лукашэнкі. Гэта спроба запалохаць незалежніцкія сілы, але нас не запалохаць".

Малады Фронт

## Мабілізацыйная кампанія на катамаранах

**8 ліпеня на Цнянскім вадасховішчы шасьцёра актывістаў Маладога Фронту правялі акцыю ў рамках мабілізацыйнай кампаніі.**

Хлопцы ўзялі два катамараны, вывесілі на іх расьцяжку з сымбалем мабілізацыйнай кампаніі – сонейкам – і плавалі па вадасховішчы. Праз мэгафон маладафронтаўцы заклікалі адпачывальнікаў прыйсьці 9 верасьня на выбары; а народу ля вадасховішча ў такую сьпякоту было каля 3 тысячаў.

Потым на беразе хлопцы правялі некалькі конкурсаў, у якіх былі разыграныя майкі і значкі мабілізацыйнай кампаніі. Менчукі прынялі гэтую акцыю на "ўра".

**Матэрыялы падрыхтавала прэсавая служба Маладога Фронту**


vytoki.net

## Пазьняк можа не вярнуцца

**Зянон Пазьняк ня верыць у шчырасьць заявы Дзяржкамітэту памежных войскаў.**

Нагадаем: Камітэт паведаміў, што З.Пазьняк можа бесьперашкодна вяртацца на Беларусь, бо ягонага прозьвішча няма ў дакумэнтах памежнага кантролю.

Лідэр КХП-БНФ цьвердзіць, што мае адваротную інфармацыю ад асобаў, у чыёй шчырасьці не сумняецца. Ён паведаміў, што вернецца на Беларусь толькі пры ўмове, калі ўлады дадуць палітычныя й юрыдычныя гарантыі ягонай недатыкальнасьці.

## Даеш стольнік... тысяч... подпісаў!

**Толькі ініцыятыўная група Аляксандра Лукашэнкі падала ў Цэнтравыбаркам належную колькасьць подпісаў грамадзянаў за вылучэньне свайго прэтэндэнта кандыдатам у прэзыдэнты.**

Астатнія пакуль не сабралі 100 тысяч подпісаў альбо ўвогуле не падавалі подпісы ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў.Такую інфармацыю даў у сераду журналістам сакратар Цэнтравыбаркаму Мікалай Лазавік. Паводле ягоных словаў, наўрад ці ўсім прэтэндэнтам удасца зарэгістравацца кандыдатамі ў прэзыдэнты. Падставы могуць быць самыя розныя.

**RR**



## Выпадковасьць або заканамернасьць?

**Ад Івана Бядко, старшыні Слонімскай Рады БНФ "Адраджэньне", стала вядома пра факт адміністрацыйнага ўціску на выбарнікаў.**

Жыхары вёскі Сялявічы, працаўнікі калгасу імя Дзяржынскага, паведамілі яму наступнае. 5 ліпеня на плянёрцы старшыня калгасу Чэслаў Шмігера сказаў, што тыя, хто не падпішацца за вылучэньне Аляксандра Лукашэнкі ў кандыдаты ў прэзыдэнты, хай не спадзяюцца на "соткі", тэхніку й іншую дапамогу ад калгасу, а таксама пагражаў звольніць з працы.

Гэты факт сьведчыць пра грубае ўмяшальніцтва адміністрацыі калгасу ў працэс збору подпісаў, пра прымус выбарнікаў выконваць жаданьні чалавека, які злоўжывае сваёй уладай. Такія дзеяньні згодна з арт. 61 часткай 8 Выбарчага кодэксу зьяўляюцца неправарнымі й могуць быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі або скасаваньня рашэньня пра рэгістрацыю кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь.

## У Горадні падрыхтаваная правакацыя супраць Домаша

**Сябры ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў за вылучэньне кандыдатам на прэзыдэнцтва ў Беларусі Сямёна Домаша накіравалі ў Цэнтравыбаркам, Гарадзенскую выбарчую камісію й абласную пракуратуру заяву з патрабаваньнем праверыць інфармацыю пра друкаваньне адной з паліграфічных фірмаў Горадні дзьвёх тысяч агітацыйных плякатаў з партрэтам Домаша.**

Паводле непацьверджаных зьвестак, яны павінны распаўсюджвацца ад імя ініцыятыўнай групы мажлівага кандыдата. У адпаведнасьці зь дзейным заканадаўствам краіны, зьяўленьне такіх плякатаў да пачатку агітацыйнай кампаніі можа аказацца падставаю для зьняцьця любой кандыдатуры з выбарчай кампаніі. У штабе Сямёна Домаша гісторыю з плякатамі называюць "адкрытай правакацыяй, накіраванай на адхіленьне рэальнага канкурэнта Аляксандра Лукашэнкі ад выбарчай гонкі".

**RR**

# У Крычаве арыштаваныя сябры ініцыятыўнай групы Сямёна Домаша

### *Ім інкрымінуюць крымінальнае злачынства – незаконнае пазбаўленьне волі*

**12 ліпеня было апячатанае памяшканьне незалежнай крычаўскай газэты "Вольны Горад", у якім часова размясьціўся штаб па зборы подпісаў за Сямёна Домаша.**

Каля 20 супрацоўнікаў міліцыі пад кіраўніцтвам выконваючага абавязкі начальніка міліцыі Ю. Казлова ўварваліся ў памяшканьне штаба, арыштавалі старшыню ініцыятыўнай групы па збору подпісаў Сяргея Няроўнага ды актывістаў групы Мікалая Маторанку й Сяргея Баравікова. Міліцыянтамі была канфіскаваная тэхніка (тры кампутары), а само памяшканьне было апячатанае. У памяшканьні засталіся падпісныя лісты за Сямёна Домаша, у якіх паставілі свае подпісы каля тысячы жыхароў Крычава.

Усю апэрацыю праводзілі каля 20 супрацоўнікаў міліцыі. Спачатку аднаму зь іх удалося трапіць у кватэру разам з адным з наведвальнікаў. Сябры ініцыятыўнай групы адразу ж папрасілі яго пакінуць памяшканьне, калі ў яго няма адпаведных дакумэнтаў на правядзенне вобыску. Аднак міліцыянт адмаўляўся пакідаць кватэру. У гэты час пад выглядам таго, што яны вызваляюць узятага ў заложнікі таварыша, астатняя група міліцыянтаў гвалтоўна ўварвалася ў памяшканьне.

Арыштаваных сябраў ініцыятыўнай групы завезьлі ў райаддзьдзел міліцыі. Пасьля гэтага Сяргея Баранава накіравалі ў гарадзкі суд, дзе прад'явілі абвінавачваньне па артыкуле 156 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях РБ (дробнае хуліганства) – за тое, што падчас затрыманьня той спрабаваў патэлефанаваць са свайго радыётэлефона. Аднак суд перанесьлі на панядзелак. Супраць затрыманых у гэты час узбуджаная крымінальныя справа па ч.1 арт.183/1 Крымінальнага кодэксу – "Незаконнае пазбаўленьне волі".

Гісторыя з рэпрэсіямі супраць ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў за Сямёна Домаша ў Крычаве пачалася яшчэ 25 чэрвеня. Тады міліцыя ажыцьцявіла першую спробу уварвацца ў офіс "Вольнага Гораду"; тады ж падчас няўдалага "штурму" аднаму з крычаўскіх журналістаў міліцыянты разьбілі фотакамэру. Другі эксцэс адбыўся 27 чэрвеня. Два дзясяткі міліцыянтаў пад кіраўніцтвам начальніка гарадзкой міліцыі каля трох гадзінаў беспасьпяхова спрабавалі ўзламаць дзьвяры кватэры, дзе разьмясьціўся штаб, жалезным ломам. Дарэчы, пасьля гэтых падзей на пасаду начальніка Крычаўскага РАУС быў прызначаны іншы чалавек.

Рэспубліканскі штаб С. Домаша расцэнвае гэты факт як рэпрэсіі супраць сябраў ініцыятыўнай групы, паралізаваньне працы па збору подпісаў за Сямёна Домаша й правакацыю, скіраваную на запалохваньне актывістаў.

**Прэс-група Сямёна ДОМАША**


vytoki.net

# Плян працы з выбарнікамі

Вызначыўшы адрасную групу, да якой вам трэба давесьці вашае пасланьне, вы павінныя вырашыць, як гэта зрабіць.

Разглядаючы розныя мэтады працы з выбарнікамі, неабходна мець на ўвазе некалькі правілаў. Па-першае, гэта правіла абмежаваных рэсурсаў: вы павінныя вызначыць, колькі часу, грошай і чалавечых рэсурсаў патрабуе кожны мэтад. Падругое, гэта правіла ўзаемазамяняльнасьці рэсурсаў і мэтадаў: часта можна выканаць адну й тую самую задачу, выкарыстоўваючы розныя рэсурсы. І апошняе: эфэктыўнасьць кожнага мэтаду розная і залежыць ад мэтаў, якія вы ставіце: перакананьня выбарнікаў, выяўленьня прыхільнікаў і заахвочваньня сваіх выбарнікаў пайсьці галасаваць у дзень выбараў (праграма "Ідзі галасаваць!").

## Правіла абмежаваных рэсурсаў

Палітычная кампанія – гэта працэс зносінаў. Усе кампаніі маюць тры асноўныя рэсурсы для выкананьня гэтай задачы: час, грошы й людзі. Гэтыя рэсурсы можна камбінаваць. Галоўнае – выбраць найлепшае спалучэньне, каб максымальна эфэктыўна выкарыстоўваць гэтыя тры рэсурсы, г.зн. найбольш паўплываць на выбарніка.

Распрацоўваючы плян працы з выбарнікамі, неабходна памятаць, што вашыя рэсурсы абмежаваныя. Калі вы вырашаеце што-небудзь зрабіць, гэта значыць, што вы вырашылі адмовіцца ад чагосьці іншага. Напрыклад, вы даручаеце 20 дабрахвотнікам разносіць друкаваныя матэрыялы, значыць, у гэты час яны ня здолеюць рабіць тэлефанаваньні. Калі вы даяце грошы на тэлерэкляму, вы забіраеце іх з сродкаў на паштовую рассылку. Час, адведзены на сустрэчу з выбарнікамі, ужо нельга выдаткаваць на кампанію "ад дзьвярэй да дзьвярэй". Важна скласьці бюджэт усіх трох рэсурсаў – часу, грошай і людзей, – каб дакладна ведаць, што вы маеце, і выкарыстоўваць усе рэсурсы найбольш эфэктыўна.

## Узаемазамяняльнасьць рэсурсаў і мэтадаў

Часьцяком можна скарыстоўваць розныя рэсурсы й мэтады для дасягненьня адной і той самай мэты. Прыкладам, вы вырашылі, што вам неабходна прыцягнуць на свой бок 10 000 выбарнікаў. Вы даручылі тысячы надзейных дабрахвотнікаў прайсьці ад дзьвярэй да дзьвярэй, разьлічваючы, што кожны пераканае 10 чалавек (ня трэба шмат часу, ня трэба грошай, але трэба шмат людзей). Асабіста вы здолееце пераканаць 10 000 выбарнікаў, паразмаўляўшы зь пяцьцюдзесяцьцю чалавекамі на дзень, за 200 дзён (ня трэба грошай, ня трэба людзей, але трэба шмат часу). Ці вы можаце зьвярнуцца да гэтых 10 000 выбарнікаў па тэлебачаньні (ня трэба ні людзей, ні часу, але патрэбныя грошы).

Гэта крайнія прыклады, аднак яны ілюструюць прынцып узаемазамяняльнасьці рэсурсаў і мэтадаў. Спачатку вам неабходна вызначыць мэту, а потым абраць найлепшы спосаб ейнага дасягненьня. Калі такі мэтад не спрацоўвае, можна скарыстаць іншы. Вось чаму такое істотнае плянаваньне – кампаніі, у якой няма пісьмовага пляну, часта бракуе сродкаў, валянтэраў і часу.

## Эфэктыўнасьць працы з выбарнікамі

Кожны мэтад працы з выбарнікамі можа быць скарыстаны дзеля дасягненьня трох мэтаў – пераканаць адрасную групу, выявіць прыхільнікаў і прывесьці сваіх выбарнікаў на выбарчыя ўчасткі ў дзень выбараў (праграма "Ідзі галасаваць!"). Важна вызначыць эфэктыўнасьць кожнага мэтаду пры выкананьні кожнай задачы і абраць такую камбінацыю мэтадаў, якая дазволіць выканаць усе задачы ў найбольш поўным аб'ёме.

Цяпер, калі ў вас ёсьць выразнае, зразумелае й эфэктыўнае пасланьне, важна давесьці яго да адраснай групы. Выбарнікі павінны ведаць і пазнаваць вашае пасланьне, а для гэтага яны павінны пачуць яго шмат разоў.

І апошняе. Па меры набліжэньня дня выбараў настае такі момант, калі ў вас ужо ня будзе заставацца часу на агітацыю вашых выбарнікаў. У гэтым выпадку вы павінныя скіраваць усе вашыя намаганьні на перакананьне прыхільнікаў вашага кандыдата прыйсьці на ўчасткі для галасаваньня і прагаласаваць за яго.

Вам неабходна: выявіць сваіх прыхільнікаў і тых, каго вы здолелі пераканаць стаць вашымі прыхільнікамі, і прыцягнуць іх на выбарчыя ўчасткі ў дзень выбараў.

## Перакананьне адраснай групы

Большая частка намаганьняў кампаніі будзе скіраваная на перакананьне вашай адраснай групы ў тым, што ваш кандыдат – іхны найлепшы выбар, і што ў іхных інтарэсах пайсьці на ўчасткі для галасаваньня й прагаласаваць за яго. Усё, што вы рабілі да гэтага моманту – усе дасьледаваньні, выяўленьне неабходнай колькасьці галасоў, "прыцэльваньне" й распрацоўка пасланьня – падрыхтавала вас да гэтага. Цяпер вам неабходна наладзіць стасункі з гэтай групай і пераканаць іх галасаваць за вас. Які сэнс у цудоўным пасланьні, калі выбарнікі пра яго ня ведаюць?

Людзі лягчэй вераць чаму-небудзь, калі даведваюцца пра гэта з розных крыніцаў. Калі ад грамадзкай арганізацыі, што карыстаецца павагай, яны чуюць, што ваш кандыдат абараняе іхныя інтарэсы, калі кандыдат прыйдзе асабіста пазнаёміцца зь імі падчас кампаніі "ад дзьвярэй да дзьвярэй", калі яны ўбачаць пераканаўчыя рэклямныя матэрыялы кампаніі, прачытаюць у газэце зычлівы артыкул пра кандыдата, тады яны з большай верагоднасьцю запомняць імя вашага кандыдата й прагаласуюць за яго. Ніводны з гэтых мэтадаў ня варта пакідаць без увагі. Пры кожным кантакце вашай кампаніі з выбарнікамі павінна гучаць адно й тое самае пасланьне, якое з кожным разам будзе станавіцца для іх усё больш пераканаўчым.

## Праграма "Ідзі галасаваць!"

Бессэнсоўна выдаткоўваць час і грошы на перакананьне вашай адраснай групы, калі выбарнікі ня прыйдуць галасаваць за вас. Выбарнікі часьцяком лічаць, што іхны голас нічога не вырашае. Трэба даць зразумець кожнаму выбарніку, што менавіта ягоная падтрымка вельмі істотная для вас. У большасьці выпадкаў дастаткова проста нагадаць – тэлефанаваньне або ўлётка, – каб яны прагаласавалі.

Праграма "Ідзі галасаваць!" часта разглядаецца як чарговы этап кампаніі. Насамрэч яе трэба разглядаць як апагей кампаніі, як кульмінацыю ўсёй вашай працы. Калі параўнаць палітычную кампанію з гандлёвым бізнэсам (у гэтым выпадку "таварам" ёсьць кандыдат), тады дзень выбараў – адзіны дзень, калі вы можаце прадаць свой тавар. Істотна, каб выбарнікі мелі дастаткова матываў "купіць" ваш прадукт у гэты дзень. Уся кампанія, і асабліва праграма "Ідзі галасаваць!", заканчваецца ў момант закрыцьця выбарчых участкаў. Вы або гатовыя да фінішнага рыўку, або не. Другога шанцу ў вас ня будзе.

Праграму "Ідзі галасаваць!" можна праводзіць па-рознаму, але выбар мэтаду залежыць ад аднаго фактару – ці ведаеце вы, каго павінныя клікаць на ўчасткі для галасаваньня.

У мясцовасьці, дзе кандыдат мае дастатковую падтрымку, прыкладам, шэсьць

*Працяг на стар 8.*

09/09/2001

КАМУ HAPPY
КАМУ END!

ВЫБІРАЙ

Пачатак на стар 7.

Тэхналёгіі

# Плян працы з выбарнікамі

зь дзесяці выбарнікаў, неабходна проста нагадаць ім усім пра дзень выбараў, імкнучыся ахапіць як мага большую колькасьць людзей. У такой мясцовасьці можна працаваць "усьляпую": вы запрашаеце выбарнікаў на ўчастку для галасаваньня, нават ня ведаючы, каго яны падтрымліваюць. Калі падтрымка вельмі моцная, кампанія можа расклеіць плякаты з нагадваньнем пра дзень выбараў і заклікамі галасаваць. Таксама мае сэнс абтэлефанаваць як мага большую колькасьць выбарнікаў.

У іншых раёнах, дзе падтрымка меншая, трэба нагадваць пра дзень выбараў толькі вашым прыхільнікам. А гэта значыць, што вы павінныя ведаць, хто яны, задоўга да пачатку праграмы "Ідзі галасаваць!". Апрача базы зьвестак (імёны й адрасы вашых прыхільнікаў), неабходна мець рэсурсы й сродкі зносінаў зь імі. Гэта значыць, важна пакінуць на гэтую працу дастаткова часу, грошай і людзей і выразна сабе ўяўляць, як вы будзеце кантактаваць са сваімі прыхільнікамі.

## Выяўленьне прыхільнікаў

Праз тое, што ажыцьцяўленьне праграмы "Ідзі галасаваць!" прадугледжвае наяўнасьць базы зьвестак задоўга да дня выбараў, неабходна ўжо на раньніх стадыях кампаніі ведаць, як выяўляць сваіх прыхільнікаў. Калі вы дакладна ведаеце, каго вы пераканалі, гэта значыць, што вы ведаеце, каго здолееце прывесьці на выбарчыя ўчасткі.

Прасьцей за ўсё вызначыць выбарнікаў, проста пытаючыся ў іх пра гэта. Звычайна людзям падабаецца, калі цікавяцца іхнай думкай, яны ахвотна распавядаюць, што яны думаюць. Працуючы з выбарнікамі, вызначайце іхны ровень падтрымкі. Перадусім трэба выдаткоўваць рэсурсы на перакананьне выбарнікаў, якія ня вызначыліся.

Працу з адраснай групай неабходна весьці так, каб мець магчымасьць хутката доступу да інфармацыі пра вашых прыхільнікаў і роўні іхнай падтрымкі. Можна карыстацца карткамі ці, што найлепш, кампутарнай базай зьвестак, якую вы зможаце пастаянна зьмяняць і дапаўняць у адпаведнасьці з паступанай інфармацыяй.

Не лічыце каго-небудзь сваім прыхільнікам, калі ён/яна самі вам пра гэта не сказалі. Можа атрымацца, што людзі не захочуць вас засмучаць, калі яны яшчэ не прынялі рашэньня, ці спрачацца з вамі, калі яны падтрымліваюць вашага суперніка. Каб ня выклікаць перадузятых адказаў, не кажыце ім, чыю кампанію вы рэпрэзэнтуеце.

Падрыхтавалі Аляксей ЯНУКЕВІЧ і Сяргей КАНДРАТОВІЧ

Навіны
Б Н Ф "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 21 (54), 13 ліпеня 2001 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нутраной дакумэнтацыі.

Адрас для ліставаньня: 220005, Менск, а/с 42, тэл/факс 284-50-12
E-mail: press_bnf@tut.by
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia



vytoki.net